ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 90 (1312) | Серада, 12 лістапада 1958 года | Цана 40 кап.

Мінск. 7 лістапада 1958 г. Святкаванне 41-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. На здымку: калоны працоўных на Цэнтральнай плошчы.

УСЕНАРОДНАЕ СВЯТКАВАННЕ

У святочны дзень сталіца рэспублікі прачнулася рана. Горад зіхацеў убраннямі. Павевы ўсходняга ветру разганялі пахмурнасць асенняй раніцы, шэры туман. Плошчы, кварталы Мінска залівала мора агнёў, чырвоных сцягоў і, здавалася, ночы не было, нібыта ніхто з мінчан не клаўся спаць пасля ўрачыстых святочных вечароў у тэатрах, клубах і дамах культуры.

Свята Вялікага Кастрычніка ўзышло над сталіцай Беларусі.

Усе выходзілі на вуліцы і спяшаліся на дэманстрацыю. Радаснымі песнямі напаўняліся шырокія плошчы. Ішлі рабочыя, ішлі інжынеры, ішлі студэнты і навучэнцы...

— Са святам! — віншавалі адзін аднаго.

— І вас таксама! — чулася ў адказ, і моцны поціск рук яшчэ больш зближаў даўно знаёмых або суседзяў ці таварышаў.

Пачыналася вясёлая гаворка:

— Ну, як вашы станкабудаўнікі, дасягнулі плана?

— Ды крыўдаваць няма чаго... Ганарыцца можна!..

— Тады яшчэ раз вітаю!

— Дзякую, віншую ўзаемна!..

А вось спатыкаліся двое, што, відаць, даўно не бачыліся, ды і, мабыць, бачыліся толькі ў час адпачынку.

— Ты ў гэтым годзе куды ездзіў?

— Сёлета прафсаюз даў бясплатную путёўку ў наш дом адпачынку...

— Ага! А я, брат, у гэтым годзе зноў пабываў на Чорным моры... Люба зараз там! Помніш, як мы ездзілі на экскурсію ў Севастопаль?

І знаёмы, здаецца, у думках прыпамінае горад-герой, уяўляе, як там цяпер адбываецца свята Кастрычніка, і адказвае:

— Сёння ўсюды весела. Сёння ўсе весялянца. Уся наша Радзіма святкуе.

Сапраўды, уявіце на хвіліну ўсе гарады нашай роднай краіны, дзе весяліцца савецкі чалавек, дзе святкуюць Вялікі Кастрычнік, — і бязмежнай здасца народная ўрачыстасць. Народ — герой, народ — будаўнік, народ — шчаслівец пад сонцам сацыялізма!

Тым часам радыёрупары абвяшчаюць пачатак парада ў Маскве. Чуецца салют...

А калоны дэманстрантаў Ленінскага раёна Мінска раўняюцца ў шарэнгі. Трапечуцца сцягі над іх галовамі. У кожнага дэманстранта адгукаецца ў сэрцы залп крамлёўскага салюта.

...Зараз паводкай хлыне народ па праспекце імя Сталіна ў Мінску.

Пакуль праходзяць войскі па Цэнтральнай плошчы, у людскім натоўпе, які запоўніў вуліцы, што прылягаюць да праспекта, граюць гармонікі, граюць аркестры. Танцуе, весяліцца моладзь. І ўсе страчаюцца, як родныя і блізкія. Прывітанні, віншаванні. Гэтае цяпло сустрэч не перадаць словамі.

Тры пажылыя дзядзькі весела гутараць:

— Сын збіраўся прыехаць... Пісаў, што прыеду. Але жонка нешта... Так што, можа, прыйду дадому, а мяне чакае віншавальная тэлеграма—з унучкай ці ўнукам...

— Слаўна, слаўна! — кажа другі.

— І мне пасылачка ад майго да свята прыбыла, — гаворыць трэці, падкручваючы вус. — На цаліне яны добра ўкараніліся!..

Колькі вясёлых усмешак, колькі радасці на тварах.

Пяраднія калоны рушылі. Пайшлі!..

Навучэнцы нясуць транспаранты. І ці то, можа, таму, што ім хочацца хутчэй падрасці, стаць дарослымі, у іх сёння жаданне падняць транспаранты як мага вышэй, над галовамі ўсіх. Надта высока.

Праспект, як рэчышча святочнага шэсця. Хоць шырокі, але для натоўпу цесны. Прыгожы ён, наш праспект.

З кожным днём працоўныя прыносяць яму што-небудзь новае. Вось нядаўна разгарнуліся вялікія будаўнічыя работы на ім ад плошчы Якуба Коласа да парку Чалюскінцаў. Работы было шмат. І калі ласка! Да свята на гэтым участку зноў пайшоў тралейбус.

Усё новым і новым упрыгожаннем увекавечваюць свой горад працоўныя сталіцы. З гэтага дня адна з найпрыгажэйшых плошчаў сталіцы будзе насіць імя Перамогі. Выканком Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных вырашыў перайменаваць Круглую плошчу горада, на якой устаноўлены помнік-абеліск воінам Савецкай Арміі і партызанам, у плошчу Перамогі.

Да гэтай плошчы ідуць і ідуць дэманстранты. Яны нясуць сцягі, транспаранты з лічбамі працоўных перамог. А потым калоны скіроўваюць з галоўнай магістралі на свае вуліцы, дадому.

— Ніна, не пазніся, роўна а сёмай, — напамінае дзяўчына сваёй сяброўцы.

— Добра, — чуецца ў адказ.

Відаць, яны дамовіліся разам правесці святочны вечар.

І колькі такіх сустрэч, вечароў адбылося ў нашых гарадах, у калгасах і саўгасах, калі запаліліся вячэрнія агні, калі грымнулі залпы ўрачыстага салюта над Мінскам. Весяліліся ў клубах, весяліліся ў тэатрах, на плошчах. На Мінскім тонкасуконным камбінаце адкрыўся новы Дом культуры. Да позняга вечара ўзляталі над сталіцай рэспублікі музыка і песні святочных кастрычніцкіх дзён...

Так прайшло ўсенароднае свята, так адзначалася незабыўная 41-я гадавіна Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Іван ГРАМОВІЧ.

Дзень партызана

Незвычайна ажыўлена было днямі на вуліцах гарадскога пасёлка Ушачы. Да раённага Дома культуры адна за другой пад'язжалі аўтамашыны, на іх лозунгі і транспаранты. Сюды з'язджаліся былыя партызаны. Прыбылі і госці з іншых раёнаў і гарадоў рэспублікі.

Звыш трох тысяч чалавек сабралася каля пакрытага белым палотнішчам помніка партызанам і воінам Савецкай Арміі. Сярод іх сакратар Віцебскага абкома партыі Герой Савецкага Саюза В. Лабанок, Герой Савецкага Саюза Ф. Дуброўскі, выкладчык палітэканоміі Полацкага педагагічнага інстытута імя Г. Скарыны В. Васілеўскі, старшыні калгасаў Д. Драгун і І. Крохатка, паэт П. Глебка і інш.

Сход адкрыў сакратар Ушацкага райкома партыі А. Іваноў. Ён расказаў прысутным аб гераічнай барацьбе партызан Ушацкай зоны супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Тав. Іваноў адкрывае помнік партызанам і воінам Савецкай Арміі, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Затым выступілі былыя партызаны—Герой Савецкага Саюза В. Лабанок, Герой Савецкага Саюза, былы камандзір партызанскай брыгады Ф. Дуброўскі.

Пасля адкрыцця помніка выступілі калектывы мастацкай самадзейнасці раёна. Затым калона аўтамашын накіравалася да вёскі Новае Сяло Селішчанскага сельсавета, дзе ўзвышаецца другі помнік. Тут выступіў П. Глебка.

Удзельнікі сустрэчы прынялі рашэнне штогод адзначаць «Дзень партызана».

В. ПЕПЯЛЯЕЎ.

Вялікія змены

Невялікім мястэчкам Магілёўскай губерні былі Бялынічы да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Некалькі брўдных крам, шынок, пачатковая школа — вось і ўсё, што мелі дарэвалюцыйныя Бялынічы.

Непазнавальна змяніліся Бялынічы за гады Савецкай улады. Тут дзве сярэднія школы, Дом культуры, кінатэатр, дзве бібліятэкі з чытальнымі залямі, кнігарня, магазін культтавараў, гарадскі стадыён і парк, дзіцячы сад, яслі.

Вось адзін дзень культурнага жыцця гарадскога пасёлка — 30 кастрычніка. У Доме культуры ідзе спектакль «Без віны вінаватыя» А. Астроўскага ў пастаноўцы Магілёўскага абласнога тэатра; у кінатэатры дэманструецца фільм «Васемнаццаты год»; у раённай бібліятэцы праводзіцца канферэнцыя чытачоў па раману «Калі зліваюцца рэкі» П. Броўкі; у беларускай сярэдняй школе вучні сустракаюцца з членам партыі з 1918 года А. Баем, удзельнікам барацьбы за станаўленне Савецкай улады ў Беларусі.

На вуліцах пасёлка многа новабудоўляў. Заканчваецца будаўніцтва сталоўкі, жылога дома для работнікаў электрастанцыі. Вырас пасёлак торфазавода.

Бялынічы жывуць вялікім змястоўным жыццём.

А. ПЛІНДАЎ.

Пісьменнікі прыйшлі ў цэх

Пісьменнік на заводзе і фабрыцы за апошнія месяцы стаў частым госцем. Ён сустракаецца з рабочымі не толькі ў бібліятэчнай зале або ў рабочым клубе, але і ў цэху ў час перапынку. Цікавасць да літаратуры з боку працоўных праяўляецца не толькі ў запытаннях і выказваннях аб той ці іншай кнізе, але і ў тым, што рабочыя набываюць кнігі беларускай мастацкай літаратуры.

Днямі ў цэх шасі Мінскага аўтазавода прыйшлі пісьменнікі М. Аўрамчык, А. Бачыла і Ул. Карпаў. Пісьменнікі расказалі аб беларускай сучаснай літаратуры, аб падрыхтоўцы да трэцяга Усесаюзнага і чацвёртага беларускага з'ездаў пісьменнікаў і да саракагоддзя БССР, прачыталі свае творы.

Прыбыў сюды і прадавец кніг. Рабочыя куплялі кнігі, многія папрасілі ў пісьменнікаў даць свае аўтографы. Было прададзена на паўтары тысячы рублёў мастацкай літаратуры.

Рабочыя засталіся задаволенымі ад такой сустрэчы і на развітанне пажадалі сваім гасцям новых творчых поспехаў.

ДА 40-ГОДДЗЯ БССР І XXI З'ЕЗДУ КПСС

Поспехі самадзейнага мастацтва

Мне давялося некалькі дзён пабыць у Віцебску на абласным агляндзе мастацкай самадзейнасці, і я быў глыбока ўсхваляваны надзвычайным размахам творчага жыцця нашага народа. Няма чаго і казаць, што росквіт духоўнай культуры людзей—яскравае сведчанне іх дабрабыту.

Поўныя творчага запалу, сабраліся ўдзельнікі агляду ў абласны цэнтр—старадаўні Віцебск, які хутка залечвае жудасныя раны вайны, апранаючыся ў новае адзенне велічнай архітэктуры сацыялізма. Ажыўленыя звонкія галасы, натхнёныя вочы, каляровыя беларускія вопраткі—усё гэта ўносіць у жыццё горада ўрачысты настрой, адчуванне свята мастацтва. Яшчэ адна акалічнасць характарызуе ўдзельнікаў агляду—сярод іх і маладыя, і старыя, і людзі сярэдняга ўзросту. Тут бачыш і барадатага дзядзьку са старой скрыпкай пад пахай, і маладога бязвусага юнака, поўных імпэту і запалу спаборніцтва.

Так, сапраўды, любіць наш народ і вясёлы спеў, і віхурысты танец, і прыгожую мелодыю, поўную душы і хараства.

На агляздзе больш за ўсё хораў і танцавальных ансамбляў. І гэта правамерна—на народзе і пяецца званчай. Хоры розныя: тут і маладзёжны хор Віцебскага музычнага вучылішча—у ім добрая культура выканання, ён пяе аб партыі, аб яе натхняючай мудрай сіле; тут і народныя хоры, змешаныя і паасобныя мужчынскія і жаночыя групы. У іх рэпертуары песні пра жніво, пра ўраджай, пра заможнае калгаснае жыццё. Але не толькі сельская тэма хвалюе спевакоў. Нядаўняе мінулае, гераічная партызанская барацьба, песні пра мір—усё гэта ў праграме харавых калектываў. Калі слухаеш дружны, зладжаны спеў, міжволі думаеш, колькі ў іх стараннасці і павагі да кампазітараў, да іх пранікнёнай творчасці, а калі чаго не хапае, то і самі ствараюць. Полацкі хор, напрыклад, любоўна выконвае песню пра свой старажытны горад, якая нарадзілася ў хоры. А прыпеўкі, бадай, усе напісаны самімі ўдзельнікамі—і словы і музыка, ды інакш і быць не можа, бо прыпеўка гэта—сённяшняе жыццё, яго надзённыя тэмы. Яна—з гумарам, з вострым словам сатыры, на вясёлай і баявой мелодыі. Вось прыпеўкі агітбрыгады Багушэўскага Дома культуры «Наш тэлевізар», створаныя самім творчым калектывам. Яны праслаўляюць знатных людзей калгасаў (прозвішчы і факты бяруцца сапраўдныя). У вясёлай жартаўлівай форме спяваецца пра ўсходы кукурузы, надоі малака, ураджай, многа і пра гультаёў, сімулянтаў, п'яніц, і балбатуноў. Паспрабуй пастаўіцца абыякава да прыпевак брыгады—не выйдзе, бо тэатралізаваны экран тэлевізара, як праз павелічальнае шкло, паказвае як станоўчае, так і адмоўнае, паказвае ў яркай даходлівай форме і належным тэмпе.

Наогул, калі глядзіш нашу мастацкую самадзейнасць, бачыш столькі цікавай выдумкі і жадання сваімі сцэнічнымі сродкамі адгукнуцца на тэму дня, што прафесійным канцэртным калектывам з самадзейнасці, як з жыватворнай крыніцы, можна бясконца чэрпаць і чэрпаць для сябе кроплі народных здабыткаў. Вось віцебскі танцавальны ансамбль паказвае танец «Дарогу кукурузе». Колькі ў ім вынаходлівых рухаў, эмацыянальных фарбаў! Маладыя, рухавыя хлопцы і дзяўчаты, апранутыя ў адпаведнасці з задумай, нібы расказваюць аб тым, як высаджваецца кукуруза, як яна расце і збіраецца. Звычайная б, здавалася, рэч. Ну, што ў ёй паэтычнага? А творчы калектыў танцораў адухаўляе гэтую справу, рамантызуе яе, і глядач дружна і задаволена апладыруе выканаўцам.

Вось другі жанр—цырк на сцэне, самадзейная акрабатыка. На простых прыладах, звычайных крэслах, спрытныя юнакі на бездакорным пачуцці балансу выраблюць такія трукі, што дзіву даешся, глядзіш і не верыш, ці магчыма гэта? Аднак, магчыма, бо зроблена ў выніку настойлівай трэніроўкі, пошукаў сваіх арыгінальных акрабатычных рухаў.

Некалькі слоў пра самадзейнае драматычнае тэатральнае мастацтва. Яно таксама на ўздыме, але ўсё ж прыкметна адстае ад эстрадна-канцэртнага. Рэпертуар драматычных калектываў за апошні час значна палепшыўся, аднак якасць яго сцэнічнай распрацоўкі ўсё яшчэ невысокая. Вядома, лягчэй развучыць якую-небудзь песню ці танец пры адпаведнай колькасці аматараў і куды больш складана сабраць калектыў выканаўцаў і паставіць з імі шматактавы спектакль. Тут у першую чаргу патрэбен спрактыкаваны кіраўнік-рэжысёр, які зможа і правільна трактаваць п'есу, давесці да кожнага выканаўцы яго творчую задачу, і з'яднаць усіх у адзіны сцэнічны ансамбль. Гэта ўсё справа нялёгкая, яна патрабуе многіх намаганняў усіх удзельнікаў спектакля. Таму, калі глядзіш спектаклі самадзейных драматычных калектываў Віцебскай вобласці, то першая слабасць, якую заўважаеш, гэта — рэжысура спектакляў. Нават у спектаклі «Паўлінка» ў пастаноўцы лепшага драматычнага калектыву (абласны прамысловы савет) ёсць месцы, якія выклікаюць пярэчанні. Гэта перш за ўсё тое, што Якім Сарока прыносіць і дае Паўлінцы лістоўкі, пракламацыі, якія яна, нібы звычайную хустку, нядбайна кладзе ў куфар, а пасля таксама адкрыта пасля вечарынкі перадае хлопцу і дзяўчыне. Не гаворачы ўжо аб тым, што гэтага няма ў камедыі Янкі Купалы, наіўна зроблена і паказана ўся сітуацыя. І другі момант выклікае простае непаразуменне і адчуванне фальшу—гэта калі Паўлінка ў фінале камедыі пачынае раптам чытаць вершы Максіма Горкага. Псіхалагічна ў яе не такі стан, каб яна магла пачаць дэкламаваць у гэтай сцэне роспачы і крыўды.

У цэлым жа спектакль пакідае добрае ўражанне, і ў гэтым немалая заслуга рэжысёра В. Латоўскага. Спектакль вясёлы, сакавіты, напоўнены яркім камедыйным гумарам, у ім выразнае пачуццё жанра твора. Добра зроблены масавыя сцэны, яны жывыя і цікавыя. Увесь ансамбль выканаўцаў праводзіць свае ролі ўпэўнена і дакладна. Паўлінка — Л. Александронак—маладая і прывабная, вельмі шчырая і лірычная, і ў той жа час у яе ёсць і паўныя валявыя якасці, і пачуццё гумару і сарказму, і многія іншыя рысы досыць своеасаблівага характару. Да пары ёй і Якім Сарока—Л. Трус. Сатырычна вельмі востра і выразна праводзіць ролю пана Быкоўскага А. Шалк. Увесь квартэт дробных шляхцюкоў—Сцяпана Крыніцкага—М. Зейф, Пранцыся Пустарэвіча — Р. Зарх і іх жанок Альжбеты (В. Нікіценка) і Агаты (Л. Зайцава) гучыць зладжана і разнастайна. Спектакль нядрэнна афармлены мастаком М. Зейф.

Добрае ўражанне пакідаюць і некаторыя сцэны са спектакля «Партызаны» К. Крапівы ў выкананні самадзейнасці Полацкага гарадскога Палаца культуры. Асабліва захапіла сваёй драматычнай напружанасцю сцэна ў хаце Рыгора і выканаўцы ролей Кацярыны (В. Жмакіна) і Рыгора (О. Янчэўскі). Кацярына—В. Жмакіна—актрыса сапраўднага драматычнага дараванння. Даніла Дрыль (В. Багачоў) і Скіба (А. Камянкоў), варожы лагер—паны Яндрыхоўскія (А. Галеркіна і Г. Сянкевіч) і кулак Маргун (Б. Яроінка) таксама заслугоўваюць станоўчай ацэнкі.

Значна слабей зроблены спектаклі «Каралеўскі гамбіт» Я. Васілёнка калектывам Аршанскага ільнокамбіната і «Не верце цішыні» І. Шамякіна Багушэўскім Домам культуры. Аднак як выбар п'ес, так і настойлівая праца над імі заслугоўвае ўхвалы. Трэба толькі гэтую працу давесці да паспяховага канца.

Абласны агляд у Віцебску пераканаўча паказаў, якія шырокія мажлівасці ёсць у нашай мастацкай самадзейнасці, якія багатыя перспектывы росту і ўдасканалення майстэрства перад ёю. Наш народ багаты шматграннымі талентамі. Трэба толькі гэтыя дыяменты ўважліва збіраць, умела адшліфоўваць і берагчы як нацыянальны скарб найвялікшай каштоўнасці.

Я. РАМАНОВІЧ.

З гарачым энтузіязмам

Звыш 600 удзельнікаў мастацкай самадзейнасці мае творчы калектыў мінскага Палаца культуры. Разнастайнасць жанраў дазваляе найбольш поўна раскрыць таленты выканаўцаў—музыкантаў, спевакоў, танцораў, чытальнікаў, мастакоў, акрабатаў і інш.

Мастацкая самадзейнасць Палаца культуры актыўна рыхтуецца да 40-годдзя Савецкай Беларусі і XXI з'езду КПСС. Напярэдадні адказны экзамен—дэкада самадзейнага мастацтва, прысвечаная 40-годдзю БССР.

Сімфанічны аркестр Палаца рыхтуе для канцэртнага выканання сімфаньету М. Аладава, тры танцы з оперы «Марынка» Р. Пукста, вальс-фантазію М. Глінкі. У садружнасці з вакальнай групай аркестрам рыхтуюцца арыя Марфачкі з оперы Я. Цікоцкага «Дзяўчына з Палесся» і арыя Кузьміча з оперы А. Багатырова «У пушчах Палесся».

Самадзейная харавая капела працуе над кантатай «Канстанцін Заслонаў» Ю. Семяякі ў суправаджэнні сімфанічнага аркестра, а народны хор—над «Баладай аб партызанцы Галіне» і беларускімі народнымі песнямі ў апрацоўцы нашых кампазітараў; танцавальны калектыў развучвае цыкл беларускіх танцаў, рускі танец і два сольныя нумары.

Аркестр народных інструментаў выканае сімфаньету М. Чуркіна, «Сказ пра Байкал» Будашкіна, вальс з балету «Спячая красуня» П. Чайкоўскага і ўверцюру да музычна-драматычнай сцэны «У купальскую ноч» М. Носкі.

Дзве беларускія песні ў апрацоўцы І. Жыновіча «Купалінка», «Зязюленька» і песню «Слава народам нашай краіны» выканае аркестр беларускіх народных інструментаў. Студыя класічнага танца рыхтуе тры танцы з оперы Р. Пукста «Марынка» ў суправаджэнні сімфанічнага аркестра.

Акрабатычны калектыў Палаца пакажа новыя акрабатычныя і эксцэнтрычныя нумары.

На спецыяльнай выстаўцы будуць экспанаваны творы студыі выяўленчага мастацтва—пейзажы ваколіц Мінска, партрэты наватараў і перадавікоў вытворчасці, карціны з партызанскай барацьбы беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Музычную драму А. Карнеева «Світанне на Нарачы» паставіць тэатральная студыя. Гэты спектакль рыхтуецца ў садружнасці з усімі калектывамі Палаца; у ім занята звыш 130 чалавек. П'еса расказвае пра паўстанне нарачанскіх рыбакоў, пра барацьбу беларускага народа з асаднікамі панскай Польшчы ў 30-я гады. Яшчэ ў маі бягучага года ў гонар надыходзячага 40-годдзя БССР Палац праводзіў мясцовы агляд—дэкаду сваёй самадзейнасці. Яна прыцягнула ўвагу шырокай грамадскасці. У выніку ў калектывы мастацкай самадзейнасці Палаца ўліліся новыя сілы. Сярод новых удзельнікаў гурткоў многа таленавітай моладзі, якая з энтузіязмам разам з «ветэранамі» рыхтуецца да свята нашай рэспублікі.

Энтузіязм, зацікаўленасць, арганізаванасць і дысцыпліна ўдзельнікаў у час падрыхтоўкі дазваляюць спадзявацца, што калектыў мастацкай самадзейнасці Палаца культуры зойме ганаровае месца ў час дэкады мастацкай самадзейнасці, прысвечанай 40-годдзю БССР.

К. КУЛАКОЎ.

7 лістапада 1958 г. Святкаванне 41-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

На зымках: (злева направа) 1. Парад войск Маскоўскага гарнізона на Краснай плошчы ў Маскве. (Фатахроніка ТАСС). 2. Перад трыбунай на Цэнтральнай плошчы Мінска праходзяць дзеячы мастацтва Беларусі. 3. Мінск. Артысты Рускага тэатра імя М. Горкага ў калоне дэманстрантаў.

Фота Ул. Крука.

Перадз'ездаўская трыбуна

НАСУСТРАЧ ПІСЬМЕННІЦКІМ З'ЕЗДАМ

Праблемы і праблемнасць

Сацыялістычная дзяржава Саветаў пражыла першы год свайго пятага дзесяцігоддзя, узняўшыся яшчэ на адну ступеньку, з якой усё выразней і выразней відаць светлая камуністычная будучыня. Гэты, як і папярэднія гады, повен велічных здабыткаў савецкага народа. Смелымі помысламі, працай залатых рук рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі запушчаны ў космас штучныя спадарожнікі Зямлі, збудаваны першы ў свеце атамны ледакод, запалены агні новых электрастанцый, адкрыты новыя багацці ў глыбіні зямных нетраў, вырашчаны і сабраны мільярды пудоў збожжа... Стваравочы неалічоныя матэрыяльныя каштоўнасці, мяняецца і сам працаўнік, на якой бы ніве ён не дзейнічаў—удасканальваецца яго прафесійнае ўмельства, расце яго духоўная культура. Заўсёды ў руху, заўсёды ў дарозе савецкі чалавек. Яго праца поўна ганаровага пачуцця наватарства, змагання за новае. Сённяшнія ўмовы існавання нашага сацыялістычнага грамадства — няспынная аўтаматызацыя прамысловай вытворчасці, прыход магутнай сельскагаспадарчай тэхнікі ў калгасы, раскрыццё новых таямніц навукі — усё гэта вымагае ўсебаковага развіцця нашага цудоўнага сучасніка, героя нашых дзён, які збіраецца выйсці на неабсяжныя творчыя прасторы надыходзячай сямігодкі.

Адлюстраваць мастацкімі сродкамі вялікую радасць нашага працоўнага дня, стварыць хвалюючыя вобразы **сённяшніх** рабочых, калгаснікаў, вучоных, мастакоў ва ўсіх праявах іх складаных характараў, у змаганні з усім тым, што перашкаджае іх плённай працы на карысць народа — пачэсная надзённая задача савецкай літаратуры. Вось чаму творчае аблічча і творчую сталасць яе вызначае перш за ўсё тэма сучаснасці, уменне адказваць на самыя надзённыя запатрабаванні часу. Варта толькі звярнуцца да гісторыі, каб лёгка пераканацца ў тым, што поспехі савецкай літаратуры, у тым ліку і беларускай, заўсёды характарызаваліся яе імкненнем да стварэння сапраўднай карціны жыцця народа.

І апошні год прынёс значныя здабыткі, якія, можа, яшчэ не даюць права гаварыць пра росквіт сучаснай тэмы, але з'яўляюцца яскравым сведчаннем выхаду савецкіх пісьменнікаў на подступы да яе. Кніг аб сучаснасці пакуль яшчэ мала — яны змяшчаюцца ў даволі сціслы, хоць далёка не поўны пералік: паэма А. Твардоўскага «За даллю-даль», раманы Г. Нікалаевай «Бітва ў дарозе», І. Шамякіна «Крыніцы», Ул. Карпава «За годам год», П. Броўкі «Калі зліваюцца рэкі», Ф. Панфёрава «Роздумы», Т. Хадкевіча «Даль палявая», М. Жасцева «Залаты пярсцёнак», «Дзярэванне» А. Кашчэйвай, «Браты Яршовы» Ус. Кочатава, «Пасля вяселля» Д. Граніна... Гэта розныя па глыбіні мастацкага адлюстравання, па свайму стылю творы. Але ўсіх іх аб'ядноўвае адно — жаданне пісьменнікаў паглыбіцца ў вялікія і разнастайныя падзеі сённяшняга дня, імкненне да шырокіх мастацкіх абагульненняў, да роздумаў над сучасным грамадскім жыццём.

Калі ж улічыць вялізны колькасны і асабліва якасны рост савецкага чытача, так характэрны для апошніх год ды дадаць сюды шырокую зацікаўленасць нашым жыццём з боку зарубежнага чытача стане відавочным недахоп кніг, дзе змяшчаецца адказ на самыя надзённыя праблемы сучаснасці. Прычын такога становішча шмат. Адной з іх, мне здаецца, трэба лічыць разгубленасць некаторых пісьменнікаў перад выключнай навізной савецкай рэчаіснасці, перад нечуванай імклівасцю развіцця нашага грамадства. Адсюль і патрабаванне нейкай паузы, нейкай «дыстанцыі часу» для асваення такога небывалага багацця жыццёвага матэрыялу. Праўда, гэтыя патрабаванні носяць чыста суб'ектыўны характар і не маюць пад сабой трывалай глебы. Яны тлумачацца творчай неадмабілізаванасцю таго ці іншага пісьменніка або яго прафесійнай недасканаласцю.

Лепшыя творы апошніх год сведчаць аб іншым — кніга аб сучаснасці, калі яна напісана не як даніна тэме, а вынашана, выпакутавана атрымлівае адразу шырокі водгук чытача. Варта глянуць на «зачытаныя» да дзірак мінулагоднія нумары часопіса «Октябрь», дзе друкаваўся раман Г. Нікалаевай або паспрабаваць знайсці ў кіёсках выпускі «Роман-газеты» з творамі І. Шамякіна, Ус. Кочатава, каб пераканацца ў сапраўдных густах чытача.

Чаму ж такі поспех прыпадае іменна на гэтыя кнігі? Таму, што ў іх прасочаны глыбінныя плыні жыцця, узняты вялікія жыццёвыя праблемы, выкліканыя небывалым узлётам творчай ініцыятывы рабочага класа, калгаснага сялянства, народнай інтэлігенцыі і звязаныя з барацьбой супраць застою і занядбанасці, якія часам перашкаджалі плённай дзейнасці савецкага чалавека. Вызначальнай рысай, якой характарызуецца кожны лепшы твор савецкай літаратуры, з'яўляецца яго **праблемнасць.**

Што ж трэба разумець пад праблемнасцю? Некаторыя схільны называць праблемным кожны твор, у якім ёсць тая ці іншая вытворчая, вузканрафесійная ці інтымная, вузка-бытавая праблема. Выходзячы з гэтага і крытыка часам спыняе сваю галоўную ўвагу на недастатковай асветленасці ў тым ці іншым творы прыватных бакоў працоўнай дзейнасці ці асабістага жыцця герояў. Напрыклад І. Шамякіна дакараюць за тое, што ён у рамане «Крыніцы» не паказаў педагагічную дзейнасць Лемяшэвіча, недастаткова шырока адлюстраваў жыццё школы. Наўрад ці стаў бы заслужаны доменшчык Платон Цімафеевіч, магутны Дзімітры, дырэктар тэатра Якаў Цімафеевіч і самы малады з іх Андрэй, сям'я кіруючага партыйнага работніка Гарбачова, дырэктар завода Чыбісаў і малады інжынер Іскра Казакова, стары акцёр Гуляеў, пачынаючы драматург Аляксахін і малады мастак Казакоў. Гэта ўсё, як іх паказаў пісьменнік, розныя людзі, непадобныя адзін да другога з прысутнымі кожнаму, часам вельмі складанымі чалавечымі перажываннямі, але аб'яднаныя вышынёй сваіх помыслаў і шчырасцю пачуццяў.

З другога боку аўтар рамана паставіў тых, хто ўсякімі шляхамі імкнецца напаскудзіць у нашым жыцці, хто процідзейнічае сумленным працаўнікам. Гэта ў першую чаргу кар'ерыст Арлеанцаў, які абапіраецца ў сваёй авантурнай дзейнасці на ілжэвынаходніка Круціліча—чалавека з антысавецкімі настроямі, паклёпніка і інтрыгана. Да іх адносіцца і Варабейны, які ў гады вайны прымусіў заастацца ў гітлераўцаў аднаго з братоў Яршовых — Сцяпана, скалечыўшы яго тым самым маральна, а цяпер выжыў з цаха самага старэйшага, заслужанага на заводзе чалавека Платона Яршова, каб заступіць яго месца і, прадаўжаць сваю здрадніцкую дзейнасць. У гэтае кодла людзей з чужой ідэалогіяй трэба аднесці і рэжысёра тэатра Тамашука, і нейкую безназоўную маскоўскую мастачку—апякунцу даўно выраджаных імпрасіяністаў і сюрэалістаў, і студэнта-крытыкана Папова з яго анархісцкімі выпадамі супраць савецкага дзяржаўнага апарата.

Гэтыя сілы святла і цемры пісьменнік здолеў так умела расставіць, што яны ўвесь час знаходзяцца ў цэнтры той вялікай, ідэйнай барацьбы, якая разгортваецца на старонках рамана.

Праблема на першы погляд сямейная становіцца агульнай — праблемай адносін сям'і да грамадства, праблемай клопату рабочай сям'і пра агульнаграмадскае, дзяржаўнае. Інакш і не можа быць у нашай краіне, дзе кожная сям'я — гэта часцінка ўсяго дзяржаўнага арганізма.

Пісьменнік не імкнецца прыхарошваць жыццё, ствараць замест жывых людзей нейкія «абразы» — ён ідзе ад суровай жыццёвай праўды. У рамане шмат дужых, здаровых, чыстых душой людзей і мастацкі ўсхваляваны паказ іх служыць адной мэце — сфармаванню стойкіх характараў у жыцці. Вобразамі Платона, Дзімітрыя, Андрэя Яршовых, Іскры Казаковай, Гуляева пісьменнік адказвае беспадстаўнаму скавытанню розных нігілістаў, рэвізіяністаў аб тым, што нібы ідэальных людзей не існуе.

Платон Яршоў, барацьба якога за сваё вяртанне ў рабочы строй, барацьба драматычна напружаная, глыбока псіхалагізаваная паказана як прыклад партыйнага адстойвання прынцыповасці і справядлівасці. Такім чынам пісьменнік не толькі заклікае да стварання прыгожых вобразаў перадавых савецкіх людзей, але і сам іх у рамане стварае. І тое, што праблема станоўчага героя, не толькі дэкларавана, але і раскрыта ў самім творы, лішні раз пацвярджае шырыню праблематыкі рамана. Цёплымі фарбамі створаны ў ім вобразы маладых будаўнікоў камунізма—Андрэя Яршова і яго жонкі Капы.

Аўтар не імкнецца чаго б тое ні каштавала застрахаваць сваіх станоўчых герояў ад памылак, нечаканасцей, калі таго вымагае логіка падзей. Наадварот, прадаўжаючы лепшыя традыцыі рускай класічнай прозы, ён імкнецца як мага глыбей зазірнуць у душу свайго героя, раскрыць усе ўнутраныя рухі яе, псіхалагічна абгрунтаваць іх. Адсюль і тое багацце фарбаў, тонаў, якімі карыстаецца пісьменнік.

Для прыкладу можна ўзяць хоць бы вобраз сакратара гаркома партыі Гарбачова. Аўтар рамана не імкнецца зрабіць яго абавязкова ўсеабдымным, нейкім «звышчалавекам», які ўсё бачыць, усё прадбачыць і ніколі не памыляецца. Наадварот, асэнсоўваючы ўбачаныя ў жыцці факты, пісьменнік паказвае, як «цякучка» штодзённых практычных спраў скіроўвае гэтага спрактыкаванага старога камуніста ў бок ад надзённай ідэалагічнай барацьбы, што абвастрылася ў горадзе пад уплывам няправільнага разумення некаторымі людзьмі мерапрыемстваў партыі па ліквідацыі шкодных вынікаў культу асобы. Інтрыганцкая дзейнасць розных прайдзісветаў вырасла да такіх памераў, што Гарбачоў, не вытрымліваючы гнуснага паклёпу Круціліча, ціне ад смяртэльнага сардэчнага прыступу.

Асноўных герояў пісьменнік паказвае не адразу закончанымі мярзотнікамі і падлюгамі. Арлеанцаў у рамане — гэта чалавек адукаваны, які ўмее працаваць і нават з уздымам, калі бачыць асабістую выгаду. Ён умее часова стварыць сабе «грамадскую думку», каб узняцца потым да нябесных вышыняў кар'ерызму. І ўсё ж рабочы калектыў завода выкрывае і выганяе з свайго асяроддзя Арлеанцава і яго пасобнікаў. Дзімітры Яршоў—загартаваны ў баях Айчыннай вайны воін у патрэбную хвіліну становіцца ў самай гушчы змагання з буржуазным індывідуалізмам Арлеанцава, які «на мутнай хвалі, узнятай рэвізіяністамі, хацеў да кіруючых пастоў пранесціся».

Барацьба з праявамі рэвізіянізма займае шмат месца ў рамане. І гэтым вызначаецца яго актуальнасць. Адна з самых вострых у сучасны момант гэтая барацьба прысутнічае і ў раздзелах, прысвечаных паказу лёсу сям'і Яршовых, яна складае аснову і тых раздзелаў, дзе адлюстравана жыццё нашай мастацкай інтэлігенцыі. З дастатковай перакананасцю аўтару рамана ўдалося стварыць вобразы дырэктара тэатра Якава Яршова, старога артыста Гуляева, маладога мастака Казакова, пачынаючага драматурга Аляксахіна і праз іх выявіць свае адносіны да надзённых праблем савецкай літаратуры і мастацтва. Гэтыя адносіны грунтуюцца на ясным і глыбокім разуменні пісьменнікам прынцыпаў сацыялістычнага рэалізма.

Аўтар рамана вядзе нас у тэатр, у кватэру акцёра, на мастацкую выстаўку, у кабінет сакратара гаркома, каб давесці асноўную сваю думку аб тым, што савецкае мастацтва заўсёды было і застаецца мастацтвам вялікіх ідэй, вялікіх характараў. Можа часам гэтая думка ў яе канкрэтных праявах не заўсёды добра падрыхтавана мастацкі, але яна прываблівае сваёй надзённасцю. Размовы аб мастацтве прадстаўнікоў рабочага класа і тэхнічнай інтэлігенцыі часам насярожваюць сваёй смеласцю, грунтоўнасцю. Аднак гэтая насцярожанасць знікае адразу, калі пачынаеш прасочваць творчы шлях аўтара рамана, яго імкненне адлюстраваць дынаміку росту савецкага чалавека.

Ус. Кочатаў даўно звязаў свой пісьменніцкі лёс з жыццём рабочага класа. У жывых вобразах трох пакаленняў сям'і патомных караблебудаўнікоў Журбіных пісьменнік здолеў увасобіць слаўную гісторыю пралетарскага руху ў Расіі, якая завяршылася перамогай Кастрычніка і пабудовай сацыялізма ў нашай краіне. У рамане «Маладосць з намі» пісьменнік звярнуўся да жыцця савецкай інтэлігенцыі, паказаўшы яе барацьбу супраць коснасці ў скарыстанні здабыткаў навукі. У новым жа рамане Ус. Кочатава «Браты Яршовы» мы сустракаемся з вялікім кругам нашых сучаснікаў—рабочай сям'ёй Яршовых, якая з'яўляецца тым асяроддзем, дзе фармуецца новае пакаленне савецкай інтэлігенцыі. Мінуў пэўны гістарычны прамежак часу і пісьменнік раскрывае новыя рысы нашага грамадства—узросшую культуру вытворчасці, узросшую палітычную актыўнасць рабочага класа, яго высокі інтэлектуальны ўзровень, якія даюць падставу гаварыць аб надыходзячым знікненні мяжы паміж працай разумовай і фізічнай, цесную сувязь інтэлігенцыі з жыццём народа, дзе яна чэрпае натхненне і матэрыял для стварэння сапраўдных здабыткаў мастацтва. Праблема духоўнага росту рабочага класа, цеснай сувязі мастацтва з народам знайшла ў рамане «Браты Яршовы» яркае выяўленне ў той агульнасці інтарэсаў, якімі жывуць сям'я Яршовых і прадстаўнікі інтэлігенцыі—тэхнічнай, мастацкай, у тым рашучым і дружным адпоры, які даюць яны розным носьбітам рэакцыйнай ідэалогіі капіталістычнага Захаду і іх падпявалам, што яшчэ трапляюцца часам у нашым асяроддзі.

Многа праблем трапіла ў поле зроку Ус. Кочатава, пэўных, канкрэтных, але не прыватных, і яны не засталіся самімі па сабе, бо пісьменнік глянуў на іх з пазіцый літаратуры вялікіх ідэй, вялікіх характараў. І не толькі глянуў, але стаў змагаром за правільнае вырашэнне іх.

Павышаны інтарэс Ус. Кочатава да шырокіх праблем агульнаграмадскага гучання і забяспечвае поспех яго раману—хвалюючай, вострапалемічнай, публіцыстычнай, багатай думкамі і пачуццямі кнізе аб нашых сучасніках, аб іх жыцці-барацьбе за пабудову камунізма. Раман «Браты Яршовы»—яшчэ адно сведчанне таго, як паасобныя факты рэчаіснасці, калі пісьменнік з партыйных пазіцый пераасэнсоўвае іх у шырокую мастацкую карціну жыцця, становяцца дзейснымі сродкамі мастацкага пераканання чытача. Тое, што пісьменнік здолеў у рамане ўзняць многія баявыя пытанні сучаснасці, робіць яго не толькі цікавай, але і карыснай кнігай у барацьбе савецкага народа за светлыя камуністычныя ідэалы.

Ул. ЮРЭВІЧ.

ПАЛАЖЭННЕ
аб літаратурных прэміях імя Я. Купалы і імя Я. Коласа

(Зацверджана пастановай Савета Міністраў БССР)

1. Прэмія імя Янкі Купалы прысуджаецца пісьменнікам БССР за высокаідэйны і высокамастацкі зборнік вершаў, паэму, мнагаактавую п'есу, апублікаваныя ў рэспубліканскім друку або пастаўленыя ў адным з тэатраў БССР у тым годзе, за які прысуджаецца прэмія, і якія атрымалі шырокае грамадскае прызнанне.

2. Прэмія імя Якуба Коласа прысуджаецца за высокаідэйны і высокамастацкі зборнік апавяданняў, аповесць, раман, а таксама крытычную працу, апублікаваныя ў друку рэспублікі ў тым годзе, за які прысуджаецца прэмія, і якія атрымалі шырокае грамадскае прызнанне.

3. Прэміі імя Янкі Купалы і імя Якуба Коласа прысуджаюцца за творы як на сучасную, так і на гістарычную тэмы.

4. Прадстаўленне твораў да прэміі імя Янкі Купалы і імя Якуба Коласа робіцца прэзідыумам Акадэміі навук БССР, навукова-даследчымі інстытутамі, навучальнымі ўстановамі, прадпрыемствамі, прафсаюзнымі арганізацыямі, праўленнямі саюзаў пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, рэдкалегіямі часопісаў, выдавецтвамі, грамадскімі арганізацыямі і дзеячамі літаратуры і мастацтва.

5. Творы, якія прадстаўляюцца на прэміі імя Янкі Купалы і імя Якуба Коласа, прымаюцца журы з 1-га студзеня па 1-е кастрычніка штогод. З 1-га кастрычніка журы разглядае ўсе работы, прадстаўленыя на прэміі, і прымае рашэнне аб прысуджэнні прэмій аўтарам найбольш выдатных твораў, а затым сваё рашэнне перадае на разгляд Савета Міністраў БССР.

6. Рашэнне журы аб прысуджэнні прэмій імя Янкі Купалы і імя Якуба Коласа зацвярджаецца Саветам Міністраў БССР і публікуецца ў друку да 1-га студзеня — даты ўтварэння Беларускай ССР.

7. Прэміі імя Янкі Купалы і імя Якуба Коласа прысуджаюцца за творы, апублікаваныя або пастаўленыя ў тэатрах БССР у годзе, што папярэднічаў таму, у якім ідзе разгляд гэтых твораў журы. Упершыню прэміі прысуджаюцца за творы, апублікаваныя і пастаўленыя ў тэатрах у 1957 годзе.

Часопісы ў лістападзе

«ПОЛЫМЯ»

У лістападаўскім нумары часопіса шырока прадстаўлена проза—працяг аповесці М. Паслядовіча «З табою побач», заканчэнне аповесці І. Шамякіна «Начныя зарніцы», апавяданне «Спадарожнік» Мухамеда Дзіба ў перакладзе С. Дорскага.

Друкуецца новае лібрэта А. Бачылы «Вернасць»—пра абаронцаў Брэсцкай крэпасці. Публікуюцца вершы М. Лужаніна.

У раздзеле публіцыстыкі і крытыкі А. Крайко і С. Крайко выступаюць з артыкулам «Пісьменнік—рэвалюцыянер», прысвечаным разгляду творчасці П. Пестрака.

Рэцэнзію на зборнік М. Хведаровіча «Залаты лістапад» публікуе С. Майхровіч. Я. Усікаў рэцэнзуе кнігу М. Ларчанкі «На шляхах рэалізма», С. Александровіч—анталогію савецкай паэзіі «Сто трыццаць паэтаў», выдадзеную ў Польскай Народнай Рэспубліцы.

«БЕЛАРУСЬ»

Адзінаццаты нумар часопіса амаль цалкам прысвечаны гаспадарчаму і культурнаму будаўніцтву на Маладзечаншчыне. Тут артыкул сакратара Маладзечанскага абкома КПБ Р. Каралёва «Вялікія змены», нарысы І. Зяновіча «Нарачы сыны», З. Горкіна «Будні раённага цэнтра», артыкул Я. Рыкліна «Жывыя старонкі рэвалюцыйнай барацьбы»—пра былых падпольшчыкаў-камуністаў, фатанарыс аб Доме-музеі Ф. Э. Дзяржынскага і інш.

Пад рубрыкай «З кангрэсу ў Стакгольме» часопіс друкуе новыя вершы П. Броўкі.

Змешчаны ў нумары таксама «Балада пра юнгу» М. Аўрамчыка, вершы С. Дзяргая, байка Э. Валасевіча «Конь і пень», урывак з новай аповесці П. Пестрака, апавяданне «Цесць» В. Хромчанкі.

У раздзеле «Новыя кнігі» друкуюцца рэцэнзіі М. Хведаровіча на зборнік вершаў Ізі Харыка, І. Сіўцова—на кнігу апавяданняў і аповесцей Р. Няхая «Навальнічнае рэха», А. Сабалеўскага—на манаграфію Ул. Няфёда пра народнага артыста СССР П. С. Малчанава.

Аб'яднанне працуе

Аршаншчына багатая літаратурнымі талентамі. Тут нарадзіліся і пачыналі свае жыццёвыя і творчыя шляхі вядомыя беларускія пісьменнікі Яўген Васілёнак, Уладзімір Корбан, Аляксандр Міронаў, Мікола Садковіч, Алесь Стаховіч, Уладзімір Караткевіч і іншыя.

Моцны ўплыў на развіццё мясцовага літаратурнага руху ў свой час аказвала знаходжанне ў Ляўках на Аршаншчыне вялікага песняра беларускага народа Янкі Купалы.

Каля пяці год існуе ў Оршы літаратурнае аб'яднанне, створанае пры рэдакцыі гарадской газеты «Ленінскі прызыў». Цяпер у ім—18 пачынаючых паэтаў і прозаікаў. Гэта—электрыкі лёнакамбіната І. Маханькоў і А. Сцяпанаў, рахункавод саўгаса А. Махнач, работнік дзіцячага дома Л. Калодзежны, сельская акушэрка Н. Тулупава, калгаснік А. Грышан, навучэнец сельскагаспадарчага тэхнікума М. Сазончык, настаўніца В. Пражэнік і інш. Аб'яднаннем за апошні час выпушчана пяць літаратурных старонак.

Спрабуючы свае сілы ў мастацкай літаратуры, маладыя аўтары актыўна звязаны з жыццём прадпрыемстваў, калгасаў, новабудоўляў. Амаль усе яны—актыўныя карэспандэнты газеты, куды дасылаюць змястоўныя заметкі, інфармацыі, артыкулы.

У апошнюю суботу кожнага месяца праводзяцца сходы членаў аб'яднання.

Бюро аб'яднання наладзіла літаратурную дапамогу рэдкалегіям раённага камсамольскага «Кракадзіла» і сатырычнай газеты «Прафілактычны ўколь»—органа гарадскога аддзела аховы здароўя.

Л. ВЫСОЦКІ.

Бібліятэка Негарэльскага сельскага клуба — адна з лепшых культасветустаноў Дзяржынскага раёна. Тут многа палітычнай, мастацкай і сельскагаспадарчай літаратуры, сістэматычна праводзяцца літаратурныя вечары. У бібліятэцы 800 чытачоў.

На здымку: бібліятэкарка Вольга Валаховіч (злева) выдае літаратуру наведвальнікам.

Фота М. Буглака.

Асаблівасці паэтычнага голасу

Здаецца, недзе з-пад зямлі, з самых яе глыбінь вырваўся і забіў струмень жывой вады. Трэба толькі зачарпнуць рукой з гэтай крыніцы, і наўкола разнясецца такі чысты водар палёў і далін, як жывыя паўстануць усе паданні зямлі, сэрца напоўніцца запаветнай любоўю да Радзімы.

Усе шляхі прыводзяць не да Рыма,
А да родных вербаў і бяроз.
Любая, ў барах сівых радзіма,
Сын твой нарадзіўся тут і ўзрос.

Усяму гэтаму дарагому і блізкаму для нас знаходзіць сваё, пранікнёнае, жывое слова малады, своеасаблівага голасу паэт Уладзімір Караткевіч, першы зборнік якога «Матчына душа» выдадзены Дзяржаўным выдавецтвам Беларусі ў гэтым годзе.

Літаратуразнаўцы кажуць, што **паэтычны голас—гэта перш за ўсё сваё, асаблівае бачанне свету, схільнасць да сваіх тэм, манера стварэння вобраза, паэтычны слоўнік, тэхнічныя прыёмы (рыфма, рытміка і інш.), свая інтанацыя.** Аб асаблівасцях паэтычнага голасу мы і збіраемся пагаварыць у артыкуле.

У вершах Караткевіча ёсць сваё бачанне свету, светаадчуванне чалавека, які ўлаўлівае складанае жыццё ў яго непасрэдным трапятанні, чуе галасы зямлі, якая адкрыла яму свае таямніцы. І ўсюды, аб чым бы ён ні пісаў, выразным і лірычным падтэкстам адчуваецца пачуццё матулі-зямлі, дарагой, святой, шматпакутнай, без якой чалавеку няма чаго жыць на свеце. Але і радзіма бачыцца яму таксама своеасабліва, у глыбіні сівых яе вякоў, у паэзіі чароўных казак, паданняў, легенд, гераічнага былога. У лепшых яго творах—«Партызанская балада», «На пачатку дарог», «Паўлюк Багрым», «Жаданы госць», «У тую ноч», «Матчына душа» і ў многіх іншых—перад чытачом адкрываецца гэтае своеасаблівае бачанне свету, свае далі, рэльефы, глыбіні.

Малады паэт неяк умее запаветным словам стварыць настрой і данесці яго да чытача. Фадзееў вельмі высока цаніў гэтую якасць паэтаў, назваўшы перадачу настрою адным з самых магічных сродкаў мастацтва.

Для Караткевіча характэрна перш за ўсё баладная, эпічная манера пісьма. Вядома, што для большасці жанраў літаратуры неабходная ўмова—дакладнасць жыццёвых падрабязнасцей, якія ствараюць плоць твора. У баладзе ж Караткевіча апрацоўка вобраза робіцца толькі ў контурах, шурпатымі, груба накіданымі мазкамі.

«Вяжуць жанчын да танкаў, дзяцей з аўтаматаў б'юць» («Партызанская балада»)—гэта не вельмі канкрэтна. Дзеянне тут узята самае агульнае. Дзейнік і выказнік, звычайна, не ўдакладняюцца.

Добра, калі паэт знойдзе і дакладную дэталь («Хаты стаяць пустыя, лісіцы спяць у хлявах, восы, стракатыя восы, гнёзды звілі ў чарапах»), але такое ўдакладненне не абавязкова пры эпічнай манеры пісьма.

У вобразе Машэкі аўтар наўмысна выдаляе гэтую эпічнасць:

«Я стаю, як корч, у воўчай скуры ўвесь... Цёмны я ўвесь...»

У кінематаграфіі гэта стары прыём — даць гераічную фігуру шырокім планам, эпічна, на ўвесь экран, спыніўшы, затрымліваючы яго нейкі час перад гледачом.

Ён пайшоў і яго схапілі на выгане
ля сяла,
А ўранку да каменданта тая ж
жанчына прышла
І сказала...—

так, шырокім планам і пададзены вобразы ў «Партызанскай баладзе». Тут таксама ўвага затрымліваецца надоўга на вобразе. Ролю гэтую выконвае суровая, скупая, трошачкі грубая нават фраза, дзе кожнае слова пастаўлена так выразна, што само ўразаецца ў памяць.

Фігура героя атрымлівае нейкую значымасць, сімвалічнасць, якраз тое, што мы называем баладнасцю.

І гэта не манернасць, калі малады аўтар наўмысна робіць шурпатай мастацкую тканіну. Паглядзіце ў баладах Куляшова, Кедрына—з фразай атрымлівае тое ж самае. Затое напісаныя такім вершам, нібыта адлітым з медзі, нават самыя голыя і неразвітыя сказы здаюцца значнымі і насычанымі.

Для гэтай жа мэты падбіраецца доўгі і мускулісты радок у баладным вершы.

Трэба адзначыць, што гэтую эпічную суровасць слову надаюць зычныя гукі. Беларуская мова, якая мае сістэму зацвярдзелых зычных асаблівай гучнасці, дае магчымасць ствараць выразныя эпічныя карціны. Вельмі часта, нават там, дзе і не чакаеш, Караткевіч падбірае іх у радок і асабліва на канец. Яго словы з зацвярдзелымі зычнымі, а таксама са збегам зычных («Твар яе быў апечаны агнём пякучым свячы», «На гасцінцах бярозы зусім пачарнелі ад ветру» і г. д.).

Малады аўтар паспяхова авалодвае і другім спосабам мастацкага адлюстравання, які тоіць у сабе вялікія магчымасці. Шляхам падбору мноства бясконца канкрэтных дэталей, дакладных падрабязнасцей, складаных, накіданых з розных бакоў, часта без бачнай сувязі, улаўлівае жыццё ў глыбіні, у самім палёце. Для гэтай манеры ён вельмі ўдала падабраў ёмкую ўмяшчальную форму—белы верш.

Гэта вельмі складанае мастацтва. У адным з лепшых вершаў зборніка—«На пачатку дарог»—гэтымі падрабязнасцямі Караткевічу ўдалося стварыць да ілюзіі яскравае адчуванне жыцця, народнага побыту, добра ўлавіць момант, як нараджаўся ў народным асяроддзі паэт.

Звярніце ўвагу, як у вершы мяняюцца адна за другой вельмі дакладныя і канкрэтныя падрабязнасці—карціны. Жанчы-

Больш выдаваць кніг для дзяцей

Напярэдадні прадстаячага IV рэспубліканскага з'езду пісьменнікаў на старонках «ЛіМа» і другіх газет і літаратурна-мастацкіх часопісаў вядуцца размовы аб поспехах і недахопах беларускай савецкай літаратуры.

Але, на вялікі жаль, амаль ніхто не ўзніме пытання аб становішчы ў беларускай дзіцячай літаратуры.

Працуючы настаўнікам на працягу многіх год і ў розных школах рэспублікі, я заўважаў, што ў школьныя бібліятэкі паступае мізэрная колькасць кніг беларускіх дзіцячых пісьменнікаў.

Незразумела, чаму Дзяржвыдавецтва БССР да гэтага часу выдае мастацкую літаратуру для дзяцей малымі тыражамі. Часта тыраж неабходнай для школьнікаў кнігі не перавышае 10 тысяч экземпляраў, тады як толькі адных агульнаадукацыйных школ у Беларусі налічваецца звыш 11 тысяч. Малюнак стане яшчэ больш дзіўным, калі да гэтага ліку школ дадаць 20 695 грамадскіх бібліятэк.

У выніку многія школьнікі зусім пазбаўлены магчымасці прачытаць тую ці іншую дзіцячую кнігу беларускага аўтара на роднай мове.

Дзеці — наша будучыня. Выхаванню іх трэба ўдзяляць вялікую ўвагу. У гэтым выключная роля належыць мастацтву, асабліва літаратуры. Такім чынам, беларускія дзіцячыя пісьменнікі і Дзяржвыдавецтва застаюцца ў вялікім даўгу перад дзецьмі.

На прадстаячым чарговым з'ездзе пісьменнікаў Беларусі пытанне аб становішчы беларускай дзіцячай літаратуры павінна знайсці самае шырокае абмеркаванне.

Н. ПАРУКАЎ,
настаўнік.

Па „глухіх“ кутках

Думка аб паездцы па «глухіх» кутках вобласці нарадзілася ў Магілёўскім тэатры невыпадкова. Тэатр ужо некалькі год жыў і працаваў на зямлі Магілёўшчыны, насіў назву абласнога, а ў многіх раёнах маглі меркаваць аб ім толькі па чутцы. Наезды ў некаторыя раённыя цэнтры не прыносілі задавальнення ні акцёрам, ні гледачам. Маршруты не ішлі далей тых месц, да якіх былі добрыя дарогі. Калгаснікі вобласці нічога не ведалі пра тэатр і, вядома, не маглі назваць яго сваім, блізкім.

Адсюль ішлі настойлівыя просьбы, запрашэнні, патрабаванні: «Пабывайце на Хоцімшчыне», «Зазірніце ў Круглае», «Чакаем вас у Краснаполлі». Адарванасць ад перыферыйнага і, галоўным чынам, ад сельскага гледача была вельмі сур'ёзнай хібай у рабоце тэатра. Дамаганні гледачоў аказалі нарэшце сваё ўздзеянне. Дырэкцыя тэатра вырашыла зрабіць доўгачасовы выезд у раённыя цэнтры і калгасы. Іменна ў тыя, дзе даўно, або зусім не ступала нага прафесійнага драматычнага калектыву. Выезд павінен быў з'явіцца творчай справаздачай тэатра перад працоўнымі вобласці напярэдадні саракагоддзя Беларускай ССР. Мелася на ўвазе абслужыць 10 раёнаў, гэта значыць усю заднепроўскую частку вобласці.

Выезд вырашана было рабіць дзвюма групамі, кожная са сваім спектаклем. Пашкадавалі, што няма ў рэпертуары тэатра спектакля пра калгаснае жыццё. Але нічога не зробіш. Давялося задавольвацца тым, што ёсць. Выбар спыніўся на спектаклях «Выбух» М. Алтухова і М. Гарулёва і «Ураган» С. Смулянскай, хоць апошні твор не вельмі ўдалы. У кожным з гэтых спектакляў не так ужо многа дзеючых асоб, і, выкарыстаўшы спрошчанае дэкаратыўнае афармленне, іх можна паказваць на параўнальна невялікіх сцэнічных пляцоўках.

Калектыў з сапраўдным энтузіязмам паставіўся да гэтага выезду. Наперадзе былі нязведаныя дарогі, хвалюючыя сустрэчы з дагэтуль незнаёмым гледачом.

І ў сонечную восеньскую раніцу тэатр рушыў у дарогу.

Дзе ні выступаў тэатр у час паездкі па вобласці: на сцэнах раённых дамоў культуры, з падмосткаў клубаў цэментнашыфернага камбіната ў Крычаве, сілікатнага завода ў Клімавічах, Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках, калгасных клубах — усюды яго прымалі цёпла і сардэчна.

Кожны вечар пасля спектакля можна было пачуць адно і тое ж:

— Прыязджайце да нас часцей!

Старшыня калгаса імя Леніна Мсціслаўскага раёна Малах Андрэевіч Андрэенка нават абурыўся, калі яму сказалі, што тэатр заехаў толькі на адзін спектакль.

— І не падумайце! Вы нас пакрыўдзіць надумалі, ці што? З усіх брыгад прыдуць людзі. Пакуль два спектаклі не адыграеце, а калгаса не выпушчу. У далейшым, прашу да нас не менш чым на тыдзень. І грашовую гарантыю абяцаем. Усё як мае быць,— гаварыў старшыня калгаса.

...Цёплае восеньскае надвор'е змянілася зацяжнымі дажджамі. Дарогі раскісілі. Нават па вуліцах раённага цэнтра Краснаполле ледзь пройдзеш. Сёння ў раённым Доме культуры спектакль для калгаснікаў. Ва ўсіх трывожна на душы: прыедуць ці не прыедуць?

Час пачатку спектакля, а ў зале пуста.

І ў гэты момант з вуліцы чуецца гул аўтамабіляў.

— Прыехалі!

Калгаснікі ўваходзяць у залу Дома культуры. У дарозе ім не раз даводзілася злазіць з машын і выцягваць іх з грязі. Але як бы там ні было, а дабраліся. І, напэўна, даўно не іграліся акцёры з такім уздымам, як у гэты дажджлівы восеньскі вечар.

У Касцюковіцкі Дом культуры на спектакль прыехалі калгаснікі з дзесяці калгасаў. Усім білетаў не хапіла і давялося іх размяркоўваць сярод перадавікоў вытворчасці.

Праўленне калгаса «Працаўнік» вырашыла, што не варта ў такі гарачы час, калі на полі стаяць кукуруза і бульба, «раз'язджаць па спектаклях».

На ранішняй нарадзе калгаснікі заявілі:

— Сёння будзем працаваць без абеду, толькі дайце магчымасць наведаць тэатр.

Брыгадзіры пад канец дня запісалі ў сваіх сшытках, што кожны выпрацаваў не менш, чым паўтары нормы.

Тэатр атрымаў многа пісьмовых і вусных водгукаў і пажаданняў. «Наш тэатр» называлі яго калгаснікі, і гэта хвалявала і радавала. І асабліва прасілі калгаснікі прывезці ў наступны раз добры спектакль пра калгаснае жыццё.

— Каб з усёй любасцю было ў ім адлюстравана тое вялікае і цудоўнае, што адбываецца ў вёсцы, каб былі паказаны людзі выдатнага розуму і прыгожай душы, якія рухаюць наперад сельскую гаспадарку, — так сфармулявала сваю думку лепшая даярка калгаса «Бальшавік» Хоцімскага раёна Марыя Ісакаўна Крывянкова.

Група спектакля «Выбух» наладзіла некалькі ранішнікаў для дзяцей. Залы раённых дамоў культуры маюць 250—400 месц, а ахвотнікаў трапіць на спектакль звычайна набіралася да тысячы. Некаторыя з тых, каму не пашчасціла набыць білет, стаялі і прасілі каля кантралёра:

— Дзядзечка, калі не можаце прапусціць, хоць раскажыце пра тое, што там паказваюць.

Наш юны гледач пакрыўджаны драматургамі і тэатрамі. Як мала напісана для яго п'ес. І як неахвотна бяруцца тэатры за пастаноўку гэтых п'ес.

У паездцы па вобласці тэатр кіраваўся задачай больш ахапіць сваімі спектаклямі калгасных гледачоў. І гэта справядліва. Калі ў некаторыя раённыя цэнтры час-адчасу і заглядаюць розныя драматычныя групы, то на вёсцы ёсць нямала людзей, якія не бачылі спектакля прафесійнага тэатра. У тэатры было вырашана захоўваць прыкладна такую прапорцыю: адзін спектакль для жыхароў раённага цэнтра, тры — чатыры для калгаснікаў вёскі. А калі дазваляюць умовы — ставіць непасрэдна на сцэнах калгасных клубаў.

Але, нажаль, вельмі мала яшчэ на вёсцы клубаў, якія маюць глядзельную залу больш чым на 100—150 месц. І гэта ў той час, калі амаль у кожным цяперашнім узбуйненым калгасе набярэцца больш за тысячу дарослых людзей. А сцэна? Звычайна — гэта такая цесная скрыначка, што калі на ёй павесіць дэкарацыі і паставіць мэблю, то не будзе дзе павярнуцца самім выканаўцам. Рэдка якая сцэна мае пакойчык, дзе можна было б акцёрам загрыміравацца.

Тут варта адзначыць ініцыятыву Чэрыкаўскага раёна. На цэнтральных калгасных сядзібах цяпер будуюць клубы на 250—300 месц з прасторнай сцэнічнай пляцоўкай і падсобным для яе памяшканнем. Гэта добра для гледача і не вельмі накладна для калгаса. Грашовыя выдаткі на пабудову такога клуба толькі ў якіх паўтары разы больш, чым на будыначак з залай на 100—150 месц.

У кожным раёне мы сустрэліся з вельмі непрыемнай з'явай. Колькі ні давалася ўказанняў, колькі ні выносілася пастаноў, многія калгасныя клубы па-ранейшаму выконваюць зусім не ўласцівыя ім функцыі свірнаў. Так, у Мсціслаўскім раёне пад збожжа занята 12 калгасных і брыгадных клубаў.

Як толькі пачалася ўборка, начапіў замок на клуб, пабудаваны нядаўна рукамі калгаснікаў, старшыня сельгасарцелі імя Сталіна Крычаўскага раёна І. П. Новікаў.

— Да вясны абыйдзецеся і без клуба,— заявіў ён.

Старшыня нават не пытаўся на гэта згоды членаў праўлення. Заняты пад збожжа на ўсю зіму добрыя клубы ў калгасах «Сацыялістычны шлях» і імя Карла Маркса таго ж Крычаўскага раёна.

І тэатру давялося ў асноўным арыентавацца на раённыя дамы культуры. Калгаснікаў сюды падвозілі на аўтамашынах. Для гэтага выкарыстоўваліся і абодва аўтобусы тэатральных груп.

Некалькі спектакляў тэатр даў і ў калгасных клубах. Хочацца яшчэ раз назваць старшыню калгаса імя Леніна Мсціслаўскага раёна М. А. Андрэенку. Добры арганізатар калгаснай вытворчасці, дбайны гаспадар, ён клапоціцца, каб калгаснікі жылі не толькі заможна, але і карысталіся здабыткамі культуры. З кожным годам усё больш сродкаў з арцельных прыбыткаў выдзяляецца ў культурны фонд. Летась было вызначана 63 тысячы рублёў, а сёлета 80 тысяч. На гэтыя сродкі папаўняецца калгасная бібліятэка, набываюцца музычныя інструменты, шыюцца касцюмы для ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці. У калгасе пабудаваны клуб на 250 месц, будуюцца брыгадныя клубы. А на чарзе, прытым у самым хуткім часе, будаўніцтва камяніцы калгаснага Дома культуры з вялікай глядзельнай залай і пакоямі для работы гурткоў.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

Дэкада савецкай музыкі ў Карэі

У гонар 41-й гадавіны Кастрычніцк рэвалюцыі карэйская грамадскасць прав ла Дэкаду савецкай музыкі. З гэтай мэт у Пхеньяне і ва ўсіх правінцыяльных цэ трах былі створаны камісіі. Цэнтральн падрыхтоўчая камісія складалася з 16 гр мадскіх дзеячоў мастацтва, музыканта артыстаў на чале з заслужаным дзеяч мастацтва КНДР старшынёй ЦП Саю карэйскіх кампазітараў Лі Мен С нам.

Дэкада была ўрачыста адкрыта перша лістапада ў Пхеньяне і ва ўсіх правін цыяльных цэнтрах краіны.

У дні дэкады шырока праводзіліся н вуковыя канферэнцыі і лекцыі аб развіц рускай і савецкай музыкі, пра яе поспех яе вопыт і ўплыў на развіццё карэйска музыкі, наладжваліся вечары савецкай му зыкі і прагляды савецкіх мастацкіх музы ных фільмаў.

Пхеньянская і правінцыяльныя радыё станцыі перадавалі савецкую музыку п спецыяльных праграмах. У Пхеньяне і в ўсіх правінцыяльных цэнтрах, у тэатра на буйных прадпрыемствах і на вуліца арганізаваны фатавыстаўкі, якія адлюстроў ваюць развіццё рускай і савецкай музыкі

На працягу дэкады цэнтральныя і пра фесійныя мастацкія арганізацыі пра вялі канцэрты і вечары савецкай музык а гурткі мастацкай самадзейнасці ў наву чальных установах, на прадпрыемствах, сельскагаспадарчых кааператывах выступ палі з разнастайнымі музычнымі нумарам

Дэкада савецкай музыкі ў Карэі не толь кі пазнаёміла шырокія колы з лепшым творамі савецкіх кампазітараў, але і паслу жыла ўкладам у справу ўмацавання друж бы і салідарнасці паміж народамі Карэі СССР.

ЛІ ГІ ЕН,
старшыня ЦП Таварыства карэйска-савецкай дружбы.

Спектакль самадзейных артыстаў

Глядзельная зала Барысаўскага гарадскога Дома культуры перапоўнена. Сюды сабраліся барысаўчане, каб сустрэць сваіх гасцей — самадзейных артыстаў Слуцкага Дома культуры, якія прыехалі з творчай справаздачай.

Павольна адкрываецца заслона, і барысаўчане з вялікай цікавасцю слухаюць оперу «Запарожац за Дунаем» Гулак-Артамоўскага.

Міжволі забываешся, што на сцэне не артысты-прафесіяналы. Сакратар слуцкага раённага Таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў Уладзімір Пасько выступае ў ролі Івана Карася. Ролю жонкі Карася—Адаркі выконвае выхавацельніца гарадскога дзіцячага дома Вольга Цырліна. Інжынер ліцейна-механічнага завода Іван Галубцоў выступіў у ролі Андрэя.

Барысаўчане горача віншавалі сваіх гасцей з паспяховай пастаноўкай оперы.

Самадзейныя артысты Барысава не застануцца ў даўгу перад сваімі сябрамі. Яны рыхтуюць пастаноўку «Машэкі», якую пакажуць у Слуцку.

Для воінаў

Новую оперу «Яснае світанне» А. Туранкова паказаў воінам Мінскага гарнізона калектыў тэатра оперы і балету.

У спектаклі выступілі заслужаныя артысты БССР Л. Бражнік, Л. Галушкіна, Т. Шымко, М. Лазараў, артысты Р. Яўраеў, А. Якімаў, В. Глушакоў, Ул. Лубяны, Л. Ганестава і інш. Дырыжыраваў народны артыст БССР Л. Любімаў.

Воіны цёпла сустрэлі новы спектакль.

Пабудавалі клуб

У гонар усенароднага свята 41-й гадавіны Вялікага Кастрычніка ў вёсцы Пагор'е Карэліцкага раёна здадзены ў эксплуатацыю будынак клуба. У клубе ёсць глядзельная зала, бібліятэка. Тут дэманструюцца кінафільмы, выступаюць з канцэртамі ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці.

М. ПАШКЕВІЧ.

ны сечкамі таўкуць бадзёра; у глоткі бочак плыве капуста, яе засыпаюць соллю з кмінам і зоркамі морквы, для духу ў яе кінуць антонаўку...

Дэталі гэтыя настолькі канкрэтныя, што мімаволі адчуваецца жыццё ў яго непасрэдным трапятанні.

Але такая манера адлюстравання мае і свой слабы бок. Калі пісьменнік, жадаючы ўлавіць жыццё ў імгненні, будуе мастацкую тканіну з дробных, не маючых бачнай сувязі, выкліканых у яго багатым уяўленні яму аднаму зразумелых пачуццяў, успыхнуўшых асацыяцый, думка траціцца сярод гэтых падрабязнасцей, і да чытача не заўсёды даходзіць багаты падтэкст твора.

У вершы «Цяга» пададзена апісанне палявання, у яго ўкладзены глыбокі гуманістычны змест і значныя думкі, але многія з іх настолькі суб'ектыўныя, што іх немагчыма ўлавіць. Не зусім даходзяць да чытача ўсе нюансы пачуцця паэта да каханай у вершах «Размова з Кіева-Пячэрскім сланом» і «Зімняя элегія».

Суб'ектыўнае ў дэталях іншы раз разрастаецца да такой ступені, што вядзе да няправільных агульных вывадаў. У вершы «У векавечнай бацькаўшчыне клёны», па Караткевічу, ўсё на свеце імгненна; толькі векавечны клён—зараз, праз сотні, праз тысячы гадоў. Незразумелая і гэта цішыня, «быццам зніклі людзі ўсе».

У сваіх вершах паэт змог глыбока зразумець і перакласці на мову вобразаў сівую мінуўшчыну беларускага народа. Але першачарговая задача мастака свайго часу —перакласці ў радкі паэзіі, гаворачы словамі паэта, жывую сучаснасць, больш грандыёзную і складаную, чым былінная, суровая, гераічная мінуўшчына.

Цікавасць чытача да вершаў Караткевіча не выпадковая. Ён вельмі дакладна ў кожным новым палажэнні адчувае характар, чалавечае, жыццёвае. Нават у суровай гераічнай баладзе ён знаходзіць гэтае агульначалавечае: каханне, да якога дваццаць год брыла жанчына ў «Партызанскай баладзе»; клопаты легендарнага героя ў апошнія хвіліны аб матулі, сёстрах, каханай жанчыне ў «Баладзе пра паўстанца Ваўкалаку». Ён за яе ішоў на смерць, а яна нават не змагла зберагчы кахання—нічога, ён дараваў усё і просіць не гаварыць аб смерці: «Хай будзе сумленне чыстым, хай спіць спакойна ўначы».

Прырода ў вершах Караткевіча—гэта выключна эфектны сродак стварэння настрою. Яна крывавая, чорная, спустошаная, як самі падзеі, у баладах. У мірных малюнках вясны, лета, восені—гэта сама да болю блізкая матуля-радзіма з яе курганамі на ростанях, калінай на мяжы, казкамі, легендамі, старой і сучаснай быллю («Матчына душа», «У дняпроўскіх хвалях, бы ў калысцы», «Бабіна лета», «Бацькаўшчына» і інш.).

Сустракаюцца ў зборніку і такія вершы, як «Дзед Цыпрук, вартаўнік калгаснага стаўка», «З падсветам», «Як размаўляюць звяры і птушкі», «Сырцовыя цагліны», у якіх аўтару не ўдалося асвятліць з'явы прыроды і нязначныя падзеі жыцця вялікай паэтычнай думкай. Верш «Сырцовыя цагліны» атрымаў бы высокае гуманістычнае гучанне, калі б аўтар правёў у канцы такую думку, што чалавек усюды—на сцежках, па якіх хадзіў, у справах, якія ён зрабіў,—пакідае вечны след, які не так хутка сціраецца з зямлі. Праўда, паэт умее нават з нязначнага факту, — шляхам падбору перакананальных падрабязнасцей жыцця, — вылепіць рэч, кавалачак жыцця, што часта і выратоўвае названыя вершы.

Нялёгкія пошукі запаветнага слова, але паэт цярпліва шукае яго ў народных нетрах. І ён дастаў жывую ваду паэзіі ў народнай творчасці, якая нясе ўсе колеры, гукі, пахі зямлі.

Такія добрыя творы, як «На пачатку дарог», «Заяц варыць піва», «Матчына душа», «Жаданы госць» і шмат іншых, асветлены глыбокай народнай мудрасцю. Але іншы раз ён траціць пачуццё мудрай прастаты, аб якой так цудоўна сказаў Горкі: «Все великолепные вещи—просты и побеждают именно своей мудрой простотой».

А ў паэта многія трапна падгледжаныя дэталі здаюцца нарачытымі і настолькі складаныя, што адразу не даходзяць.

Мая здабыча кулічок іржавы(?)
з пярсцёнкам залатым (?) каля вачэй.

Караткевічу трэба баяцца захаплення тэхнікай, якая, ператвараючыся ў самамэту, можа загубіць паэзію. «Яна рэч фармальная, цуд можа быць і без яе»,—любіў паўтараць у такіх выпадках Фурманаў.

Вершы «Лісце», «Праменьчык» і некаторыя іншыя аздоблены прыгожа, тонка, узорна, але халодныя, мала кранае сэрца гэтая бліскучая краса.

Мы не будзем гаварыць яшчэ раз аб тых недахопах, на якія ўжо ўказвалі Караткевічу старэйшыя таварышы ў друку. Былі ў яго і ёсць памылкі фармалістычнага характару, якія яму трэба пераадольваць.

Для творчай манеры Караткевіча характэрна выкарыстанне ёмкіх гучных кораняў старажытна - рускай мовы (гун, раўніна, рацъ), а таксама слоў уласнага словаўтварэння (юнь—юнацтва, духмян—водар і інш.). Радуе смеласць аўтара ў рабоце над моўным матэрыялам, але многія словы ў мастацкай тканіне здаюцца русізмамі або штучна робленымі.

Любімым колерам паэта з'яўляецца сіні, які сустракаецца па некалькі разоў амаль у кожным вершы. Хаця ў народзе гэты колер лічаць праяўленнем глыбіні, жыццёвасці і сілы, але злоўжываць нават і добрай рэччу нельга.

Яшчэ адзін бок, найбольш відавочны, які перш за ўсё адкрывае арыгінальнасць творчага почырку аўтара,—гэта інтанацыя. Праўда, дзе-ні-дзе ў яго можна сустрэць куляшоўскія, ясенінскія, някрасаўскія матывы, але гэтага не ўдаецца пазбегнуць нават самым выдатным майстрам, асабліва ў гады росту.

Інтанацыя ў вершы Караткевіча свая, арганічная, падпарадкавана выразнасці мастацкіх сродкаў. Яна заўсёды энергічная, мускулістая, не надакучае і не закалыхвае.

Глыбока ў народным жыцці ляжыць вытока крыніцы. Струмені яе не знікнуць, Прабіваючы сабе дарогу, яны, вядома, выносяць разам з крынічнай вадою і муць. Але яна сплыве, як толькі крыніца набярэцца сілы.

А. ЯСКЕВІЧ.

І. П. Катлярэўскі

(Да 120-годдзя з дня смерці)

10 лістапада споўнілася 120 год з дня смерці выдатнага пісьменніка, класіка ўкраінскай літаратуры Івана Пятровіча Катлярэўскага. Сваімі творамі — «Энеіда», «Наталка-Палтаўка», «Песня на новы 1805 год...» і «Маскаль-чараўнік» («Салдат-чарадзей») ён увайшоў ва ўкраінскую літаратуру.

У літаратуры пісьменнік выступаў тады, калі ў Расіі (а значыць, і на Украіне) было ўстаноўлена прыгоннае права, пра якое Ул. І. Ленін пісаў: «Прыгонніцкае права, асабліва ў Расіі, дзе яно доўга трымалася і дасягнула самых грубых форм, яно нічым не адрознівалася ад рабства». А паэт дае такую характарыстыку гэтай эпосе:

Пропали! Як сірко в базарі!
Готовте шиї до ярма!
По нашому хохлацьку строю
Не будеш цапом, ні козою,
А вже запевне що волом:
І будеш в плузі паходжати,
Де бровара дрова таскати...

Іван Пятровіч Катлярэўскі нарадзіўся 9 верасня 1769 г. і рос у Палтаве, вучыўся ў мясцовай семінарыі, не скончыўшы якой (каб не быць свяшчэнаслужыцелем), некаторы час працаваў то канцылярыстам, то настаўнікам у памешчыцкіх маёнтках. Тут ён збірае этнаграфічны матэрыял, вывучае песні, мову, быт, звычаі народа. На гэты перыяд прыпадае яго пачатак работы над паэмай «Энеіда». Калі яму было 27 год, ён пакідае настаўніцкую работу, ідзе ў армію, прымае ўдзел у руска-турэцкай вайне 1806—1808 гг., вызначыўся пры штурме крэпасцей Ізмаіл і Бендэры, выканаў складанае дыпламатычнае даручэнне камандавання па далучэнню буджацкіх татар на бок Расіі. У 1808 г. ён у чыне капітана ідзе ў адстаўку і едзе ў Пецярбург, каб паступіць дзе-небудзь на работу. Вядомы паэт і адважны афіцэр, але без грошай і пратэкцый вымушаны выехаць са сталіцы, нідзе не паступіўшы на службу. У 1810 г. вярнуўшыся ў Палтаву, атрымаў сціплую пасаду наглядчыка (г. зн. дырэктара. — **Ан. З.**) дома выхавання бедных.

Айчынная вайна 1812 г. не прайшла міма паэта, ён прыняў удзел у ёй, паспяхова сфарміраваўшы з народных апалчэнцаў на Палтаўшчыне 5-ы казацкі конны полк, які прыняў удзел у барацьбе з напалеонаўскімі захопнікамі.

Катлярэўскага ведалі, любілі і паважалі многія дзеячы рускай і ўкраінскай культуры, да яго звярталіся за парадамі, атрымлівалі патрэбныя і вельмі важныя адказы па этнаграфіі, гісторыі, народнапаэтычнай творчасці.

Многа зрабіў Катлярэўскі і для ўкраінскага тэатра: ён быў дырэктарам аднаго з першых на Украіне Палтаўскага тэатра, тут, пры актыўным удзеле паэта быў выкуплены з прыгоннікай залежнасці рускі артыст М. С. Шчэпкін. Украінскі паэт Максім Рыльскі нядаўна пісаў пра Катлярэўскага:

Він ревно клопотався,
Шоб викупити Щепкіна з неволі,
Як потім для Шевченка молодого
Робили те Жуковський и Брюллов.

Але самая вялікая заслуга Катлярэўскага—напісанне ім для мясцовага тэатра двух п'ес: «Наталка-Палтаўка» і «Маскаль-чараўнік».

Катлярэўскі прымаў актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці краіны: ён быў выбраны членам масонскай ложы «Любві да ісціны», арганізаванай у Палтаве дзекабрыстам Новікавым, праз якога Катлярэўскі пазнаёміўся з ідэямі дзекабрыстаў і падзяляў іх; у 1821 г. быў выбраны ганаровым членам Пецярбургскага вольнага таварыства аматараў расійскай славеснасці.

У 1827 г. ён атрымаў яшчэ пасаду папячыцеля дабрачынных устаноў, праяўляючы гуманнасць і бацькоўскія клопаты аб хворых, старых, бяздомных і сіротах. Памёр Катлярэўскі 10 лістапада 1838 г. на 70-м годзе жыцця.

Найбольш буйным творам пісьменніка з'яўляецца яго гумарыстычная паэма «Энеіда», у якой у вобразах багоў і герояў Рыма аўтар паказаў жыццё і быт украінскага народа канца XVIII — пачатку XIX стагоддзя.

Паэма «Энеіда» — таленавіты, арыгінальны, напоўнены нацыянальным колярытам і народным гумарам твор, пра які газета «Правда» у 1938 г. пісала, што ўкраінская тэма прыцягнула ўвагу чытачоў «не смешнымі ўкраінцамі, перапранёнымі ў траянцаў», а «усхвалявала чытачоў жывым рэалізмам адлюстравання народа, цёплым гуманным пачуццём, пранікнёнай сатырай на багатых, на жорсткіх памешчыкаў».

«Лебядзінай песняй» творчасці Катлярэўскага з'яўляецца п'еса «Наталка-Палтаўка», напісаная ў 1819 г. спецыяльна для Палтаўскага тэатра, якім ён кіраваў.

У чым жыццёвая сіла п'есы, якая вось ужо 140 год не сыходзіць са сцэны? На гэта карыфей украінскай драматургіі і тэатра І. Табілевіч адказаў так: «У незвычайнай прастаце, праўдзе і, самае галоўнае, у любві аўтара да свайго народа, у любві, якая з сэрца Катлярэўскага перайшла ў яго твор. Не з вышыні глядзіць Іван Пятровіч на свой народ, не высмейвае яго, а стаіць побач з ім, як мастак, зліўшыся ў адно з народам, дае высокі артыстычны твор, узор народнай паэзіі ў драматычнай форме».

Сваёй творчасцю І. П. Катлярэўскі адкрыў новую старонку ў гісторыі развіцця ўкраінскай літаратуры. Ён праўдзіва паказаў сучасную яму рэчаіснасць, у сатырычным плане паказаў прыгнятальнікаў народа, выказаў спачуванне да працоўных і спрабаваў аблегчыць яго становішча. У яго творах упершыню ва ўкраінскай літаратуры на ўвесь голас прагучала народная мова. Катлярэўскі накіраваў літаратуру па таму шляху, якім развівалася літаратура братняга рускага народа.

Творчасць І. П. Катлярэўскага высока ацанілі выдатныя дзеячы рускай і ўкраінскай літаратуры. В. Г. Бялінскі назваў яго «разумным і таленавітым маларасіянінам». Тарас Шаўчэнка ў год смерці Катлярэўскага напісаў верш, у якім прадказаў яму вечную славу:

Будеш, батьку, панувати,
Поки живуть люди;
Поки сонца з неба сяе,
Тебе не забудуть!

Іван Франко пісаў, што Катлярэўскі ўнёс у літаратуру «бездакорна чыстую і багатую мову, шчырую любоў да радзімы і асабліва да працоўнага, зняважанага і прыгнечанага народа». А. М. Горкі раіў украінскім, савецкім пісьменнікам: «Чаму б вам не напісаць такі вясёлы бурлеск, як, скажам, «Энеіда» пра нашых ворагаў? Сабраліся буржуазныя дыпламаты дзесьці на астраўку і думаюць, што яны вылечваюць увесь свет... Камічныя людзі. А хіба пятлюраўская эміграцыя не дае колькі хочаш матэрыялу для такога бурлеска?»

У Палтаве, у родным горадзе паэта, у 1952 г. адкрыты літаратурна-мемарыяльны музей яго імя. У шасці прасторных і светлых залах сабрана і экспанавана шмат матэрыялаў, якія расказваюць пра жыццё і грамадска-палітычную дзейнасць гэтага выдатнага паэта і драматурга. За пяць год музей стаў далёка вядомым за межамі Украіны, штогод наведваюць дзесяткі тысяч працоўных з розных канцоў нашай Радзімы. Музей праводзіць вялікую работу па папулярызацыі творчасці пісьменніка і навукова-даследчую работу.

Супрацоўнікі музея часта выступаюць на старонках друку з артыкуламі па асобных праблемах жыцця і творчасці пісьменніка. У музеі і па-за музеем арганізоўваюцца літаратурныя вечары, сустрэчы пісьменнікаў, артыстаў, выканаўцаў ролей Катлярэўскага з наведвальнікамі. Запісы ў кнізе ўражанняў гавораць аб вялікай любві працоўных да памяці свайго вялікага паэта.

Ан. ЗАЛАШКА,
дырэктар Палтаўскага літаратурна-мемарыяльнага музея І. П. Катлярэўскага.

Выстаўка работ англійскіх фотамайстроў

З кожным годам пашыраюцца культурныя сувязі Беларусі з замежнымі краінамі. Рэспубліку наведалі дэлегацыі Францыі, ЗША, Італіі, Галандыі і іншых капіталістычных дзяржаў. Члены дэлегацый пазнаёміліся з жыццём працоўных, наведалі культурна-асветныя ўстановы—музеі, бібліятэкі, клубы. Сведчанне пашырэння гэтых сувязей—і выстаўка мастацкай фатаграфіі каралеўскага фатаграфічнага таварыства Вялікабрытаніі, якая адкрылася днямі ў Мінску ў мастацкім салоне-магазіне.

На выстаўцы экспануецца звыш ста мастацкіх фота. Яны прысвечаны розным тэмам і ў некаторай ступені знаёмяць з жыццём, побытам і культурай англійскага народа. Іх з цікавасцю разглядалі наведвальнікі выстаўкі. Гэта зразумела. Яны вывучалі замежнае фотамайстэрства, пераймалі вопыт.

Вось, напрыклад, здымкі «Лонданскі пейзаж» В Спіда і «Сонца і аблокі» Дж. Робертса. Абодва цікавыя па задуме. Лонданскі пейзаж такі, якім мы і ўяўлялі яго: карпусы заводаў, коміны, дым. Праз дым вырысоўваецца вялізны будынак. На другім здымку—заліў і вёска. Адчуваецца, што дзесьці недалёка горад. Пра жыццё працоўнай Англіі расказваюць здымкі «Рамантуюць сеці» Д. Радзінгера і «Пахмурная раніца» Т. Марысона. Добрае ўражанне пакідаюць мастацкія фота «Рукі і скрыпка» В. Марыновіч, «Воз з мяхамі» Е. Хэдкока, «Ля штурвала» С. Вуда і інш. Такіх фатаздымкаў—большасць.

Разам з тым ёсць і невыразныя па задуме работы. Мы маем на ўвазе два фатаздымкі—«Мысліцель» і «Небаскробы» Б. П'юга.

Гэтую выстаўку, якая атрымана ад Англійскага таварыства культурнай сувязі з СССР, з цікавасцю разглядаюць працоўныя сталіцы Беларусі.

К. СІМАНЧУК.

Каштоўная ініцыятыва

У нашых гарадах многім вуліцам прысвоены імёны праслаўленых герояў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, імёны выдатных людзей. Аднак, многія жыхары-гарадоў не ведаюць, чаму гэтыя вуліцы так названы. Вельмі карысная з'яўляецца таму ініцыятыва Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея, які пачаў выпуск брашур серыі «Іх імёнамі названы вуліцы Гродна». Адна з такіх брашур прысвечана Рыгору Гаркавым. Яго імя прысвоена буйнейшай вуліцы Гродна, на якой знаходзіцца рад прадпрыемстваў, навучальных устаноў. Брашура апавядае пра геройскае жыццё аднаго з сыноў Камуністычнай партыі, які загінуў у час вызвалення Заходняй Беларусі. Другая брашура гэтай жа серыі знаёміць чытачоў з жыццём Вольгі Соламавай. Яе імя носіць таксама адна з вуліц Гродна. З брашуры чытачы даведваюцца, як жыла Вольга да вайны, як у вайну яна была сакратаром Гродзенскага падпольнага гаркома камсамола, як загінула ў час выканання баявога задання.

Брашуры карыстаюцца вялікім попытам у наведвальнікаў музея. Цяпер падрыхтаваны да друку брашуры пра Элізу Ажэшка і Кастуся Каліноўскага. Запланаваны выпуск брашур серыі «Яны змагаліся за ўладу Саветаў».

І. АРАНСКІ.

У вясковым культмагу

У вёсцы Баршчоўка саўгаса «Рэчыца» адкрыўся культмаг, у якім асноўнае месца займае мастацкая літаратура.

Толькі за першыя некалькі дзён работы культмаг прадаў палітычнай, мастацкай і сельскагаспадарчай літаратуры больш, чым на тры тысячы рублёў.

Людзей у магазіне заўсёды бывае многа. Вось прыйшоў рабочы саўгаса Пятро Бракарэнка, які просіць даць яму байкі К. Крапівы, зборнік вершаў Якуба Коласа і кнігу «Вернасць слову» М. Даніленкі.

А вось падыходзіць да прылаўка Сяргей Панчанка, які купляе «Святло над Ліпскам» М. Паслядовіча і зборнік вершаў А. Астрэйкі.

Не шкодзіла б, мусіць, новаму культмагу мець і сваіх распаўсюджвальнікаў друку ў такіх аддзяленнях саўгаса, як Капань, Чорнае, Аляксандраўка, Гранаўка і іншых, бо там таксама любяць мастацкую літаратуру.

Я. ТУЛУПАЎ.

Рэчыцкі раён.

Узнагароджанне групы пісьменнікаў

За актыўную культурна-шэфскую работу ў часцях Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту і ў сувязі з 40-годдзем Савецкіх Узброеных Сіл, якое адзначалася ў лютым гэтага года, прэзідыум Цэнтральнага камітэта прафесіянальнага саюза працаўнікоў культуры і Галоўнае палітычнае ўпраўленне Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту ўзнагародзілі ганаровымі граматамі вялікую групу беларускіх пісьменнікаў і паэтаў. Сярод узнагароджаных Мікола **Аўрамчык**, Пятрусь **Броўка**, Юрый **Багушэвіч**, Сяргей **Грахоўскі**, Міхась **Калачынскі**, Навум **Кіслік**, Уладзімір **Корбан**, Аляксандр **Лазнявы**, Іван **Мележ**, Дзмітрый **Палітыка**, Піліп **Пестрак**, Пятро **Прыходзька**, Максім **Танк**, Іван **Шамякін**.

Днямі ў Саюзе пісьменнікаў БССР узнагароджаным былі ўручаны ганаровыя граматы.

Брайант заўсёды супрацоўнічала з амерыканскімі камуністамі, хоць фармальна не лічылася тады ў амерыканскай камуністычнай партыі Ул. І. Ленін меркаваў аб ёй па яе справах.

Бесі Біці прысвяціла рэвалюцыйнаму Петраграду кнігу «Чырвонае сэрца Расіі».

Джон Рыд, Луіза Брайант і іншыя прагрэсіўныя амерыканскія журналісты тых год былі першымі прадстаўнікамі сусветнай грамадскай думкі, якія прыехалі ў Расію вучыцца ў рускіх рабочых і сялян будаваць новы свет, а не навучаць «адсталы рускі народ» заходняй цывілізацыі.

Уладзімір Ільіч усяляк садзейнічаў амерыканскім журналістам у іх імкненні ўбачыць рэвалюцыйную рэчаіснасць Расіі. Шмат разоў гутарыў з Леніным амерыканскі літаратар Роберт Майнор, які стаў камуністам. Ленін збіраў дадзеныя, якія характарызуюць паварот карэнных амерыканскіх рабочых на рэвалюцыйны шлях.

Роберт Майнор у час першай сусветнай вайны знаходзіўся ў Еўропе ў якасці карэспандэнта рэвалюцыйнага друку. Пазней Майнор стаў адным з кіраўнікоў кампартыі ЗША.

Асабліва моцнае ўздзеянне на амерыканскую грамадскую думку аказалі прадстаўнікі амерыканскага ўрада, пасланыя ў Расію прэзідэнтам Вільсанам з мэтай рэгулярнай інфармацыі аб падзеях, якія там адбываюцца.

Палкоўнік Рэймана Робінс і публіцыст Лічкольн Стэфенс не апраўдалі спадзяванняў прэзідэнта і прывялі ў лютасць Вашынгтон. Яны расказвалі праўду. Яны сцвярджалі, што бальшавікі карыстаюцца падтрымкай рускага народа і што Савецкі ўрад варта прызнаць. Усё жыццё яны адстойвалі гэты пункт погляду.

Рэймана Робінс падарожнічаў па Расіі, калі на чале ўлады знаходзіўся Керанскі, і пераконваўся, што сапраўдная ўлада — у руках Саветаў. Робінс сустракаўся з Леніным. Пасля вяртання ў ЗША ён выступіў з лекцыямі перад шматлікімі слухачамі. Сваімі бліскучымі выступленнямі ён садзейнічаў устанаўленню дружбы з Расіяй. Палкоўніка Робінса празвалі «мільянерам, які любіў Леніна».

Гнеў публіцыста — разгрэбальніка бруду — Стэфенса прагучаў яшчэ ў 1904 г. у кнізе «Ганьба гарадоў», якая з'явілася вынікам падарожжа аўтара па буйных гарадах і штатах Амерыкі. Стэфенс быў падаўлены брудным рэчаіснасцю, якая адкрылася перад ім.

У Расію ён, як і Робінс, таксама папаў пры Керанскім і таксама пераканаўся, што сапраўдная ўлада — у руках Саветаў.

Стэфенс аказваецца цалкам захопленым справамі і лёсам рускай рэвалюцыі. Дзесяткі старонак яго «Аўтабіяграфіі» і двух тамоў «Пісем» прысвечаны рэвалюцыйнай Расіі.

Лінкольн Стэфенс належыць да ліку тых, хто зразумеў гістарычную ролю Савецкай Расіі ў самы цяжкі перыяд блакады і інтэрвенцыі.

Зразумеў і выкрыў мэты брыдкай кампаніі, таму што ў Савецкай Расіі была скінута «старая, жахлівая, варожая цывілізацыі эканамічная і палітычная сістэма», таму што там вядучая частка чалавецтва паспяхова выконвала работу, якую прадстаяла выканаць усяму свету. Адна фраза Стэфенса ўвайшла ў гісторыю. Гэта быў адказ на пытанне, ці быў ён у Расіі. «Я пабываў значна далей, чым у Расіі. Я зрабіў паездку ў будучыню, і яна цудоўная».

Гэта быў выдатны адказ на пагромніцкую, паклёпніцкую кампанію амаль усёй амерыканскай прэсы супраць краіны Саветаў.

Пісьменнік і журналіст Лінкольн Стэфенс усё сваё далейшае жыццё прысвяціў вытлумачэнню людзям сэнсу рускай рэвалюцыі.

У радах прагрэсіўных пісьменнікаў, якія адлюстроўваюць рэвалюцыйны настрой амерыканскага народа, вырастаюць такія фігуры, як Мэры Хітан Ворс, Майкл Голд, Джазеф Халар, Ньюг Кейн, Э. Б. Магіл, Джазеф Фрылан, які перакладаў рускіх рэвалюцыйных паэтаў, у тым ліку і Маякоўскага, і іншых, творчасць якіх адчула бясспрэчнае ўздзеянне сацыялістычнай рэвалюцыі, нават калі яна і не знайшла свайго прамога адлюстравання.

Кастрычніцкая рэвалюцыя — самы яркі і самы выдатны прамень святла ва ўсёй сусветнай гісторыі, які асвятліў розумы чалавецтва. Гэты прамень асвятляе чалавецтву шлях да будучыні. Таму за тэмы Кастрычніка неаднаразова звяртаюцца не толькі гісторыкі, філосафы і даследчыкі мастацтва, але і пісьменнікі, публіцысты, рэпарцёры. Тэма Кастрычніка заўсёды будзе заставацца натхняючай, жывой і дзейснай.

Л. КРАСНЕЎСКАЯ.

Галоўны рэдактар Мікола ТКАЧОЎ.

Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Аляксандр БУТАКОЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Аркадзь МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), Пятро ПРЫХОДЗЬКА, Раман САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), Янка ШАРАХОЎСКІ, Іван ШАЦІЛА, Рыгор ШЫРМА.

Міністэрства культуры БССР з глыбокім жалем паведамляе аб заўчаснай смерці дырэктара Брэсцкай абласной бібліятэкі Мікалая Маркавіча УНУКАВА і выказвае сваё глыбокае спачуванне сям'і нябожчыка.

кцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25.
туры — 3-21-53, выдавецтва — 3-19-52, бухгалтэрыі — 3-11-03.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА НА ГАЗЕТУ: на месяц—3 р. 50 к., на квартал — 10 р. 50 к., на паўгода — 21 р., на год — 42 р.